**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у сакавіку**

Прайшлі мерапрыемствы да **Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і незаконным абаротам наркотыкаў**.

**1 сакавіка. ЦБ.** Прайшла дыялогавая пляцоўка “Наркотики. Ответственность. Последствия.” Для вучняў старэйшых класаў СШ №1, №2, №3 была арганізавана сустрэча з прадстаўнікамі розных ведамстваў. Намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Лунінецкага райвыканкама Вольга Сяргееўна Калугіна расказала аб формах уліку непаўналетніх, якія ўчынілі тыя ці іншыя правапарушэнні, прывяла статыстычныя даныя па Лунінецкім раёне і Брэсцкай вобласці. Урач-псіхолаг УЗ “Лунинецкая центральная районная больница” Вера Эдуардаўна Санюковіч растлумачыла як спраўляцца з уласнымі праблемамі і не трапіць на абяцанні “лёгкага жыцця” і “лёгкіх грошай”. Оперупаўнаважаны адзялення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Лунінецкага РАУС Ілья Анатольевіч Ігнацюк растлумачыў пытанні прававой адказнасці за злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркотыкаў, прывёў актуальныя прыклады з практыкі супрацоўнікаў РАУС. Таксама распавёў аб дастаткова высокай меры пакарання, якая пагражае за ўжыванне, захоўванне і распаўсюджванне наркатычных сродкаў.

У бібліятэках раёна праводзяцца мерапрыемствы, прысвечаныя **85-годдзю з часу утварэння Брэсцкай вобласці.**

**5 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Бібліятэка пачала цыкл краязнаўчых мерапрыемстваў для школьнікаў “Вандроўка па роднаму краю”. У бібліятэцы прайшла гульня-віктарына “Ці ведаеш ты Беларусь?” для другога класа СШ №1. Дзецям расказалі пра памятныя мясціны Беларусі, звязаныя з ваеннымі падзеямі, асабліва спыніліся на Брэсцкай вобласці.

Для вучняў 4-га класа віктарыну правялі ў школе.

**ЦДБ.** Бібліятэка запусціла анлайн-тур «ОткройДляСебяБрестчину». З яго дапамогай можна здейсніць падарожжа па гарадах і раённых цэнтрах Брэсцкай вобласці. Кожны месяц на ютуб канале Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі будзе выходзіць выпуск, прысвечаны пэўнаму гораду Брэстчыны. У першым выпуску расказалі аб горадзе Брэсце.

У бібліятэках РЦБС прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню жанчын.**

**7 сакавіка. ЦБ.** Арганізавалі акцыю-віншаванне “Чудесный день – 8 Марта». Мэтай акцыі было павіншаваць мілых чытачак са святам і ўручыць невялікія падарункі.

**7 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Правялі цыкл мерапрыемстваў. Для вучняў 2 “В” і 4 “А” класа СШ №2 арганізавалі конкурсную праграму “Ох, уж эти девочки». Дзеці ўдзельнічалі ў разнастайных конкурсах: «Загадки», «Какая ты хозяйка», «Собери слово», «Музыкальный калейдоскоп», «Поздравления» і інш.

**7 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Для прадстаўніц старэйшага пакалення праведзена літаратурна-музычная кампазіцыя “Ёсць у жанчыне асаблівая загадка”. Вершамі ўласнага сачынення прысутных павіншавала ўдзельніца народнай літаратурна-паэтычнай студыі “Літаратурная правінцыя” Алена Кудач. Усе прысутныя прынялі ўдзел у віктарынах “Цветочная” і “Искусные повара». Завяршылася мерапрыемства майстар-класам па прыгатаванню «Тортостаканчик «Цветочный горшочек с вишневой начинкой», які правяла кандытар Зінюк Я.Ф.

**7 сакавіка. ЦДБ.** Для маленькіх чытачоў арганізавалі акцыю “Чытаем вершы для матуль і бабуль”. Відэаролік змясцілі на ютуб канале цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Прайшлі мерапрыемствы ў сельскіх бібліятэках. Так, у **Рэдзігераўскай і Бастынскай с.б.** былі арганізаваны конкурсы дзіцячых малюнкаў “Мілай маме”. У **Лунінскай і Палескай с.б** прайшлі творчыя заняткі “Мама, сонца і вясна”. Святочныя канцэрты адбыліся ў сельскіх бібліятэках-клубах: “О той, что дарует нам жизнь и тепло” **(Кожан-Гарадоцкая с.б-ка-клуб)**, “Все песни для любимых” **(Дребская с.б-ка-клуб).**

**13 сакавіка. ЦБ.** Адбыўся семінар-нарада бібліятэчных работнікаў «Роль публичных библиотек в воспитании патриотизма и гражданственности среди различных групп пользователей». У ходзе семінара супрацоўнікі бібліятэк абмяркавалі асноўныя напрамкі, мэты і задачы грамадска-патрыятычнага выхавання, падзяліліся вопытам работы па рэалізацыі мерапрыемстваў і праектаў.

Шэраг мерапрыемстваў прымеркавалі да **Тыдня праваслаўнай кнігі.**

**14 сакавіка. ЦБ.** У духоўна-асветніцкім цэнтры “Вытокі” афармілі выставу-прагляд праваслаўнай літаратуры “Каштоўны дар – праваслаўная кніга”.

Супрацоўнікі бібліятэкі прынялі ўдзел у XI праваслаўных адукацыйных чытаннях “Радасць слова”, прысвечаных 15-годдзю Дня праваслаўнай кнігі, 35-годдзю адраджэння Пінскай епархіі і 265-годдзю з дня ўтварэння самастойнай праваслаўнай абшчыны ў в.Язвінкі. Галоўны бібліёграф Іна Бушыла правяла агляд праваслаўнай літаратуры ля кніжнай выставы “Прыгажосць Божага свету”.

**14 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Прайшла гадзіна духоўнасці “Вечныя каштоўнасці праваслаўя” з удзелам святара царквы “Стрэчання Гасподня” горада Мікашэвічы пратаірэя Уладзіміра Кавальчука. Святар патлумачыў прысутным ролю праваслаўнай літаратуры ў духоўна-маральным развіцці асобы чалавека, карысць малітвы і чытання духоўнай літаратуры.

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.**

**15 сакавіка. ЦБ.** У Публічным цэнтры прававой інфармацыі для вучняў СШ №1 правялі інфармацыйную гадзіну “Конституция – основной закон нашей жизни». У рамках мерапрыемства прайшла сустрэча з адвакатам юрыдычнай кансультацыі Лунінецкага раёна Налляй Іванаўнай Чухліб, якая расказала прысутным аб правах і свабодах, гарантаваных асноўным Законам краіны. Галоўны бібліёграф правяла віктарыну “Я – грамадзянін сваёй краіны!”

**12 і 14 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Прайшоў цыкл мерапрыемстваў да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Супрацоўнікі бібліятэкі наведалі СШ №1 і правялі для навучэнцаў 3-х класаў прававую гульню "Галоўны закон жыцця краіны". Дзеці пазнаёміліся з Канстытуцыяй РБ, сімволікай нашай дзяржавы, удзельнічалі ў гульні "Збяры карту Беларусі", "Раскажы пра сцяг і герб", "Я ведаю гарады", замацавалі веды аб правах дзіцяці, якія прапісаны ў Канстытуцыі РБ.
**15 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** У бібліятэцы прайшла гадзіна прававых ведаў для ўдзельнікаў клуба "САМИ".

У бібліятэках прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Сусветнаму дню паэзіі.**

**19 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Адбыўся паэтычны вернісаж "И вновь душа поэзией полна». Вучні 10 "А" класа СШ №2 даведаліся пра ўзнікненне свята, паслухалі вершы знакамітых пісьменнікаў. У канцы паэтычнага вернісажу вершы ўласнага складання прачытаў адзін з удзельнікаў мерапрыемства – Максім Горбат.
**21 сакавіка. ЦБ.** Для навучэнцаў 8 "Б" класа СШ №1 арганізавалі паэтычны вечар "Поэзии прекрасный дивный мир» з удзелам паэта Лунінеччыны, старшыні народнай літаратурна-паэтычнай студыі "Літаратурная правінцыя" Віктара Пінігіна.
**21 сакавіка. ЦДБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі правялі ў СШ №1 літаратурную гадзіну "Кніжныя юбіляры". Школьнікаў пазнаёмілі з кнігамі-юбілярамі 2024 года.

Прайшлі мерапрыемствы да дня **Хатынскай трагедыі.**

**22 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Для вучняў 10 "Б" класа прайшла гутарка-рэквіем "Хатынь – символ вечной памяти и скорби". На мерапрыемства запрасілі Алену Адамаўну Кудач, удзельніцу клуба "Паэтычная глыбінка". Бібліятэкар расказала прысутным аб трагічнай гісторыі вёскі Хатынь, аб мемырыяльным комплексе "Хатынь", расказала пра знічтожаныя вёскі Лунінецкага раёна.
**22 сакавіка. ЦБ.** Для вучняў 8-х класаў СШ №3 правялі гістарычную гадзіну "Хатынь – симвал вечной памяти и скорби". На мерапрыемстве прысутнічаў краявед Аляксандр Яраховіч, які падрабязна расказаў вучням аб Хатыні і вёсках, якія паўтарылі лёс Хатыні. Навучэнцы паглядзелі відэаролік і ўшанавалі памяць хвілінай маўчання.
Прайшлі мерапрыемствы і ў іншых бібліятэках. Для дзяцей у **цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы** адбыўся ўрок памяці "Нязгасны боль Хатыні". У **Любачынскай с.б.** прайшла інфармацыйная гадзіна "Ёсць памяць, якой не будзе забыцця". У **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшла гадзіна гісторыі "Сімвал памяці і скорбі".